Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь
УА "Палескі дзяржаўны універсітэт"
БІБЛІЯТЭКА
ІНВ. №

Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Зарэгістраваны ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Пасведчанне № 691 ад 25.09.2009 г.
Выходзіць штомесяц са студзеня 2006 г.

# ГІСТОРЫЯ
## праблемы выкладання

"У дапамогу педагогу"
Серыя

## № 11 (101) ' 2010

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ**

**Мікалай Іосіфавіч МІНЦКІ — галоўны рэдактар,** *доктар гістарычных навук, прафесар*

**У. В. ТУГАЙ — першы намеснік галоўнага рэдактара,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**Н. М. ГАНУШЧАНКА — намеснік галоўнага рэдактара,** *кандыдат гістарычных навук*
**Л. В. САЛАМАХА — адказны сакратар**
**І. І. БАГДАНОВІЧ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. В. ПАНОЎ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. М. ХОДЗІН,** *кандыдат гістарычных навук*
**В. М. ВАРАНОВІЧ**
**Л. У. ЖЭРКА**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА**

**У. В. ТУГАЙ — старшыня рэдакцыйнай рады**
**М. М. ЗАБАЎСКІ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**А. А. КАВАЛЕНЯ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. А. КАПРАНАВА,** *доктар педагагічных навук, прафесар*
**І. В. КАРПЕНКА**
**Г. А. КОСМАЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**У. С. КОШАЛЕЎ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**М. С. СТАШКЕВІЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. М. ФАМІН,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**І. І. ЦЫРКУН,** *доктар педагагічных навук, прафесар*
**С. М. ХОДЗІН,** *кандыдат гістарычных навук*



**Заснавальнік і выдавец —**
**РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"»**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск; тэл.: 297-93-20 (адк. сакратар),
297-93-22 (аддзел маркетынгу), факс: 297-91-49
e-mail: aiv@aiv.by, http://www.aiv.by

# ГІСТОРЫЯ
## ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ

ЗМЕСТ ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ

3 **Миницкий Николай.** Когнитивное моделирование исторического образовательного знания

8 **Одериха Вадим.** Китай в XVI—XVIII вв. Урок в VIII классе

14 **Григорьев Владимир.** Этносы периферийных территорий европейского континента в I — середине IV в. н. э. Урок всемирной истории в V классе

АРГАНІЗАЦЫЯ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ

18 **Ященко Тереза.** Тематические опорные конспекты по всемирной истории

27 **Мельникова Алла.** Современный урок истории: парадоксы педагогических традиций и новаций

30 **Шауро Анжела.** Основные тенденции социально-экономического и политического развития Востока (1918—1939)

34 **Рогачук Наталья.** «Если б камни могли говорить...»

41 **Беляева Галина.** Российское государство в XVI в.

46 **Зенова Татьяна.** Усиление Московского княжества

ДАПАМОЖНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

49 **Саллум Ферас.** Сирия и проблема ближневосточного урегулирования (1990—2003)

ВЫВУЧАЕМ КРЫНІЦЫ

55 **Гагуа Руслан.** Лісты Ягайлы як крыніцы даследавання Грунвальдскай бітвы

СЛАВУТЫЯ ІМЁНЫ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

59 **Кухарева Елена.** Почётный гражданин Греции Зигмунт Минейко

ЮБІЛЕІ

63 **Стрелец Михаил.** Владимир Никифорович Сидорцов: портрет учёного и педагога

*Для афармлення першай і чацвёртай старонак вокладкі часопіса выкарыстаны фотаздымкі К. К. Шастоўскага «Помнік Уладзіміру Караткевічу ў Віцебску» і «Руіны замка Сапегаў у Гальшанах».*

© РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"», 2010
© Вокладка. Р. А. Раманцоў, К. К. Шастоўскі, 2010

# ЛІСТЫ ЯГАЙЛЫ ЯК КРЫНІЦЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ГРУНВАЛЬДСКАЙ БІТВЫ

***Матэрыялы для настаўніка да тэмы «Беларусь у ВКЛ (другая палова XIII — першая палова XVI ст.)», XI, XI' класы***

*Руслан Гагуа, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта (г. Пінск)*

Грунвальдская бітва, якая адбылася 15 ліпеня 1410 г. паміж аб'яднанымі войскамі Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага з аднаго боку і арміяй Тэўтонскага ордэна — з другога, дагэтуль прыцягвае ўвагу гісторыкаў. Да сённяшняга часу канчаткова не вырашаны шэраг пытанняў, што датычацца розных аспектаў бітвы [1]. Аднак многія крыніцы, якія маглі б праліць святло на дадзеныя праблемы, дагэтуль застаюцца не перакладзенымі на беларускую ці рускую мову. Іх пераклад, публікацыя і аналіз маюць вялікае практычнае значэнне не толькі для гістарычных даследаванняў, але і для выкладання гісторыі Беларусі ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах [2]. Выкарыстанне разнастайных крыніц дазволіць на больш якасным узроўні праводзіць семінарскія заняткі, на якіх разглядаюцца пытанні знешняй палітыкі ВКЛ, развіваць уменні навучэнцаў працаваць з гістарычнымі крыніцамі, выхоўваць пачуццё патрыятызму і гонару за мінулае Айчыны.

На падставе апісання падзей на Грунвальдскім полі, якое зрабіў польскі храніст Ян Длугаш, складаецца ўражанне, што кароль Ягайла амаль не прымаў удзел у бітве і нават не праследаваў крыжакоў, якія ўцякалі з поля бою, а назіраў за ўсім гэтым з пагорка [3, с. 109]. Гэта паведамленне хронікі, напісанае чалавекам, які нарадзіўся ў 1415 г., было, верагодна, перапрацаваным з ананімнай «Хронікі канфлікту», створанай амаль адразу пасля Грунвальдскай бітвы [4, с. 61—69]. Так, на яе старонках знаходзім звесткі аб тым, што Ягайла, «перайшоўшы праз невялікі лясок з месца ўзгаданага лагера, прыбыў на вяршыню аднаго пагорка, дзе ў той жа час злез з каня і, стаўшы на калені на зямлю, пачаў дзякаваць Богу за перамогу, якую той яму дазволіў атрымаць над ворагам [5]. У адрозненне ад версіі Яна Длугаша яна паведамляе, што польскі кароль трапіў на гэты пагорак толькі пасля захопу ўмацаванага крыжацкага лагера: «Кароль жа... зняўшы па прычыне незвычайнай спякоты свой шлем, з усімі сваімі людзьмі падышоў да крыжацкага лагера. У лагеры ж многія, убачыўшы, што ўцёкі ніяк не дазволяць пазбегнуць смерці, стварыўшы з вазоў падабенства вала, там жа ўсе пачалі абараняцца, але ўсё ж такі, пераможаныя, у пашчы мяча загінулі» [6].

Аб непасрэдным удзеле караля ў пагоні за ўцякаючымі крыжакамі сведчаць і іншыя крыніцы, а менавіта лісты Ягайлы да сваёй жонкі, каралевы Ганны, і познаньскага біскупа Альберта, датаваныя 16 ліпеня 1410 г. Створаныя на наступны дзень пасля Грунвальдскай бітвы ў каралеўскай паходнай канцылярыі, гэтыя лісты маюць навуковую каш-

тоўнасць як гістарычныя крыніцы. Яны былі ўведзены ў навуковы зварот у XIX ст., аднак дагэтуль на беларускую альбо рускую мову не перакладаліся. Нават арыгінальныя тэксты на лацінскай мове змешчаны ў выданнях, якія з'яўляюцца цяжкадаступнымі не толькі для шырокага кола аматараў сярэднявечнай гісторыі, але і для прафесійных гісторыкаў.

Прыведзены ніжэй пераклад абедзвюх крыніц зроблены згодна з тэкстамі, якія нямецкі медыявіст Э. Штрэльке змясціў у чацвёртым дадатку да тома выдання «Гісторыкі Прусіі» [7].

### Ліст Ягайлы да каралевы Ганны

*16 ліпеня на полі бітвы пад Дамброўна*

Найпрыгажэйшая княгіня, знакамітая і нам вельмі любая жонка наша! Ад нашага з Вамі расставання заўсёды і няспынна Творца неба і Зямлі нас і людзей нашых міласэрнасцю і ласкай адараў і ў добрым захоўваў здароўі. І пад яго абаронай на зямлю ворага ўступіўшы, колькі б ні спыняліся пад якім-небудзь горадам, каб яго захапіць, заўсёды яго без цяжкасцей захоплівалі. Тады ў аўторак, у свята Разаслання Апосталаў, магістр крыжацкі з усімі сваімі сіламі да войскаў нашых наблізіўся, жадаючы бітву з намі пачаць, калі мы руплівa слухалі імшу святую. Яе да канца набожна выслухаўшы з усім войскам нашым, на поле бітвы выйшлі, дзе баявыя рады пастроіўшы і размясціўшы, імкнуліся пачаць бой. Калі ўжо адзін на другога паглядалі, магістр крыжацкі і маршал праз сваіх герольдаў нам і найсвятлейшаму князю пану Вітаўту, брату нашаму найдаражэйшаму, два мячы даслаў са словамі: «Ведайце, кароль і Вітаўт, што ў гэтую гадзіну бітву з вамі пачнём, гэтыя ж мячы вам у дапамогу дарма ахвяруем. Дазвольце ж нам уласна абраць тое месца для бітвы альбо самі выбірайце». На што адказалі лагодна: «Мячы, якія нам даслалі, прымаем і ў імя Хрыста, які каркі напышлівых згінае, біцца з вамі будзем, але месца бою паказаць вам ані можам, ані хочам, у бітве жа з вамі ў месцы сустрэнемся, якое Бог усёмагутны даць нам вырашыць. Пасля чаго без зацяжкі, войска маючы ўжо пастроенае, як ужо гаварылася, пачалі бой, у якім сярод незлічоных забітых, самі ж вельмі нязначныя маючы страты (не дзякуючы нашай моцы альбо народаў шматлікасці, але адзіна дзякуючы моцы і дабрыні Бога, які толькі б заўсёды нам поспех дарыў), узгаданых вялікага магістра і маршала, Шварцбурга і эльбінгскага і іншых комтураў крыжацкіх пасеклі, іншых да ўцёкаў прымусілі і асабіста пачалі гнаць. Дзве мілі яны былі гнаны, а ўцякаючы, у азёрах і рэках, якія знаходзіліся на іхнім шляху, у велізарнай колькасці патанулі, іншыя ж былі забіты, так што вельмі нямногія ратаваліся. Б'ючыся ж з прусамі, якіх з ласкі Божай перамаглі і разграмілі, Конрада Малодшага Алесніцкага, Крыштафа з Венгрыі і іншых незлічоных гасцей ордэнскіх да няволі схапілі і як палонных трымаем.

Дадзена пад Дамброўна на полі бітвы, у сераду, на наступны дзень пасля свята Разаслання Апосталаў.

### Ліст Ягайлы да познаньскага біскупа Альберта

*1410, 16 ліпеня каля Астэродэ на полі нашай бітвы*

Першаму з годных, высокашаноўнаму бацьку, пану Альберту, біскупу познаньскаму, сапраўды нам ласкаваму, Уладзіслаў з боскай ласкі кароль Польшчы і г. д. Першы з найдастойнейшых, высокашаноўны бацька! Калі мы як звычайна слухалі імшу Панскую, вялікі магістр крыжацкі з усімі сваімі сіламі, якія толькі меў, да нашых наблізіўся войскаў, прагнучы з намі біцца і нашых праліць кроў нявінную, нам і князю Вітаўту, брату нашаму любаму, два мячы даслаў з такімі словамі: «Вам два мячы дасылаем у дапамогу, таму што сёння з намі ў палявой бітве змагацца мусіце, а месца бою нам вызначце, альбо мы самі яго вызначым». На што так у рахманасці душы нашай адказалі: «Мячы, якія вы нам даслалі, прымаем і прыняць жадаем: з вамі, звяртаючыся да імя Хрыстова, у бітве сысціся хочам; месца ж бітвы вам вызначыць не дазваляем і не мы вырашаем, але ўсемагутны Бог, які ўсім кіруе і сусвет упарадкоўвае, месца, у якім з вамі біцца будзем, ужо нам падрыхтаваў». Нарэшце самі з цвёрдасцю і без маруджання войскі нашы падрыхтавалі і, пастроіўшы,

накіравалі супраць ворага, які рухаўся да бою. Там не мужнасцю рукі нашай альбо шматлікасцю народаў узброеных, але адзіна боскімі магутнасцю і мужнасцю, якія нас заўсёды ад годных працівнікаў ахоўваюць, вельмі мала з нашых войскаў і нікога з больш знатных не страціўшы, усе варожыя войскі знішчылі і самага вялікага магістра з маршалам, шварцбурскага і ельбінскага, а таксама іншых многіх комтураў, крыжакоў барадатых аддалі мячу і палонных бясконцых да нашых шатроў сагналі. І наяўных палонных, сярод якіх былі князь Конрад Малодшы і князь шчэцінскі Казімір і іншыя ворагі настолькі шматлікія, што колькасці іх не ведаем, прынялі і ў палон накіравалі. І так ворагаў перамаглі і да ўцёкаў прымусілі, тых жа нямногіх, якім застацца ў жывых было дазволена, самі ва ўласнай асобе праследавалі і праследаванню аддаваліся да чатырох міляў. Там бясконцае мноства ўцекачоў было забіта і многія ўцякаючыя ў вадзе патанулі. Мы сапраўднаму Богу нашаму за нашу перамогу выказвалі вялікую падзяку на працягу дзвюх міляў; і пасля самога праследавання да шатроў нашых вярнуліся здаровым і непашкоджаным з-за боскай ласкі і заступства фартуны. Таму да бацькоўскіх пачуццяў вашых звяртаемся і заклікаем, а таксама да боскай ласкі звяртаемся, што нам не за нашы такія значныя прошлыя заслугі і дорыць дабрыню. Мы шчаслівыя маліць, як і раней, аб літасці да нас, захаванні годнасці і дазваленні поспеху над ворагамі, якога дасягнулі, звярнуць поўнай перамогаю.

Дадзена каля Астэродэ ў нашым вайсковым лагеры ў сераду на наступны дзень пасля свята Разаслання Апосталаў. Таксама калі ў пятніцу ранкам з горада нашага Хоэштэйна выйсці захацелі, прыбылі да нас земскія нобілі з павета і горада Хельдэнбурга, паіншаму Хольдэнштэйна, яны і горад і замак, добра ўмацаваны, нам ва ўладу аддалі.

Паведамленне пана Мікалая, віцэ-канцлера Каралеўства Польскага.

Аналіз гэтых тэкстаў дазваляе зрабіць некалькі высноў не толькі аб асобных спрэчных момантах грунвальдскіх падзей, але таксама аб навуковай вартасці некаторых крыніц для даследавання бітвы.

Па-першае, не выклікае сумненняў непасрэдны ўдзел Ягайлы ў баі пад Грунвальдам, які асабіста праследаваў уцекачоў, што адпавядае паведамленню «Хронікі канфлікту», але разыходзіцца са звесткамі «Гісторыі Польшчы» Яна Длугаша.

Па-другое, магчыма дакладна рэканструяваць эпізод з двума мячамі, якія былі дасланы польскаму каралю Ягайле і вялікаму князю літоўскаму Вітаўту крыжакамі перад пачаткам бітвы. Лісты Ягайлы пацвярджаюць радкі «Хронікі канфлікту», згодна з якой «прыбылі да караля два герольды: адзін караля венгерскага, які прынёс каралю аголены меч ад імя магістра, другі — шчэцінскага князя, які трымаў у руцэ падобны меч, які маршал прыслаў князю Вітаўту і сказаў: "Кароль! Магістр дасылае табе гэты меч, а другі мы павінны ўручыць ад імя маршала брату твайму Вітаўту, калі зможам з ім сустрэцца"». Кароль у той жа час паслаў да Вітаўта верных пасланцаў і папрасіў утрымацца ад пачынання бітвы, да якой ён імкнуўся ўжо з людзьмі сваімі. Пакінуўшы сваіх рыцараў, Вітаўт хутка прыбыў да караля, і пасля яго прыбыцця ўзгаданыя герольды аддалі яму меч ад імя маршала і сказалі каралю і Вітаўту: «Кароль і Вітаўт! Магістр і маршал дасылаюць вам гэтыя мячы ў якасці падтрымкі і заклікаюць вас да бітвы і запытваюцца ў вас аб месцы спаткання, прапануючы, каб вы самі яго абралі і аб зробленым вамі выбары паведамілі. І не хавайцеся ў гушчы гэтага лесу і не марудзьце з выступленнем да бою, таму што ва ўсялякім выпадку вы не здолееце пазбегнуць бітвы». Кароль жа і Вітаўт прынялі ўзгаданыя мячы з вялікай дабрынёй душы і так адказалі магістру і маршалу праз паслоў: «Прымаем дапамогу Панскую як самую важную, а разам з ёю тыя мячы ў якасці нашай падтрымкі і жадаем з магістрам сысціся ў бітве. Таксама не будзем хавацца па лясах, таму што прыбылі памерацца з вамі [сіламі], паколькі не можам атрымаць ад вас справядлівасці. А месца бітвы пакідаем на волю і ласку Божую» [7, с 436—437].

Аднак лісты супярэчаць апісанню эпізода з мячамі, дадзенага Янам Длугашам, які сцвярджаў, што герольды магістра звярталіся толькі да караля, а імя і тытул Вітаўта нават не ўзгадалі [8, с. 15—22].

Акрамя гэтага, паводле Я. Длугаша, Вітаўта наогул не змаглі выклікаць і абодва мячы былі ўручаны Ягайле. Адказ польскага караля крыжакам у перакaзе храніста, бясспрэчна, большай часткай заснаваны на мастацкім вымысле і не адпавядае рэчаіснасці [9, с. 98—99].

Па-трэцяе, параўнанне «Хронікі канфлікту» і «Гісторыі Польшчы» Яна Длугаша з лістамі Ягайлы дазваляе зрабіць выснову, што большага даверу ў якасці гістарычнай крыніцы заслугоўвае менавіта «Хроніка канфлікту», у той час як Я. Длугаш выступае ў ролі тэндэнцыйнага і схільнага да мастацкіх упрыгожванняў аўтара. Таму да звестак, прыведзеных у творах «бацькі польскай гісторыі», трэба ставіцца крытычна і выкарыстоўваць іх па магчымасці толькі пасля параўнання з іншымі крыніцамі.

**Спіс выкарыстаных і цытаваных крыніц**

1. *Гагуа, Р. Б.* Вялікая вайна Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польскага з Тэўтонскім ордэнам у 1409—1411 гг. / Р. Б. Гагуа // Гістарычны альманах. — 2003. — Т. 8. — С. 165—166; Гагуа, Р. Б. Западноевропейская и американская историография Великой войны с Тевтонским орденом в 1409—1411 годах / Р. Б. Гагуа // Весн. Гродн. дзярж. ун-та імя Янкі Купалы. — Сер. 1. Гуманітарныя навукі. — 2005. — № 3 (33). — С. 35—42.
2. *Гагуа, Р. Б.* Грюнвальдская битва как национальный символ в белорусской культуре / Р. Б. Гагуа // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., 8—9 дек. 2005 г., Гродно / отв. ред. проф. М. А. Можейко. — Гродно : ГрГУ, 2006. — С. 328—329.
3. *Длугош, Я.* Грюнвальдская битва / Я. Длугош. — М.-Л, 1962.
4. *Гагуа, Р. Б.* Хроніка канфлікту Уладзіслава караля Польшчы з крыжакамі ў год Хрыстоў 1410 / Р. Б. Гагуа // Беларус. гістар. штогоднік. — 2005. — № 6. — С. 61—69.
5. Cronica conflictus Wladislai, Regis Poloniae, cum cruciferis anno Christi 1410 // Scriptores rerum Prussicarum. — B. 3. — Leipzig, 1866. — S. 438.
6. 1410 16 Juli retro Dambrownis in campo prelii // Scriptores rerum Prussicarum. — B. 3. — Leipzig, 1866. — S. 425—426; 1410 16 Juli prope Hastenrode in campo prelii nostril // Scriptores rerum Prussicarum. — B. 3. — Leipzig, 1866. — S. 426—427.
7. Cronica conflictus Wladislai, Regis Poloniae, cum cruciferis anno Christi 1410 // Scriptores rerum Prussicarum. — B. 3. — Leipzig, 1866.
8. *Гагуа, Р. Б.* Российская и белорусская историография сражения при Грюнвальде / Р. Б. Гагуа // Весн. Гродзенскага дзярж. ун-та Я. Купалы. — Сер. 1. Гуманітарныя навукі. — 2003. — № 2(20). — С. 15—22.
9. *Длугош, Я.* Грюнвальдская битва / Я. Длугош. — М.-Л., 1962.